# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

3 красавіка 2024 г. № 13 (746)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# «ПАТРЭБЕН ВЫНІК! ЛЮДЗІ ЗВЯРНУЛІСЯ — ЗРАБІЦЕ»

## З якімі пытаннямі прыходзілі да Наталлі КАЧАНАВАЙ падчас асабістага прыёму грамадзян



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**У насычаным працоўным графіку Старшыні Савета Рэспублікі асаблівае месца адведзена рабоце са зваротамі насельніцтва. Веданне праблем людзей знутры дазваляе прымаць канкрэтныя, у тым ліку заканадаўчыя, рашэнні. Часта скарга аднаго чалавека агаляе сур'ёзныя недахопы ў той ці іншай сферы дзейнасці, якія аператыўна ліквідуюцца. Аказваючы дапамогу грамадзяніну, сенатары паляпшаюць сітуацыю ў цэлым, і праблемы, якія спелі гадамі, перастаюць непакоіць людзей.**







Асабістыя прыёмы грамадзян сталі брэндам верхняй палаты парламента. Жыхары ўсіх рэгіёнаў краіны імкнуцца сустрэцца з членамі Савета Рэспублікі, асабіста са спікерам, бо давяраюць заканадаўцам. Аб гэтым сведчыць і прыём грамадзян, які Наталля Качанава праводзіла 27 сакавіка ў Савеце Рэспублікі.

### За валакіту прыцягнуць да адказнасці

Мінчанка Наталля Рыгораўна расказала, што восенню яе кватэру затапілі суседзі, аднак дагэтуль не ліквідаваны наступствы затаплення: страхавая кампанія ўскладае фінансавыя выдаткі на ЖЭС, а ЖЭС — на страхавую кампанію. Дагэтуль не складзены каштарыс на рамонтныя работы.

Як патлумачыў намеснік старшыні Мінгарвыканкама Алег Корзун, які прысутнічаў на прыёме грамадзян, гэтая паслуга платная.

— Гэта ж не яе віна, а суседзяў — значыць, яны і павінны плаціць, — лічыць Наталля Качанава і ўдакладняе, дзе прапісана такое правіла. У сувязі з гэтым спікер паставіла задачу перагледзець адпаведны нарматыўна-прававы акт. «Па-першае, там дакладна павінна быць прапісана, на працягу якога часу складаецца гэты каштарыс, — канкрэтызавала сваё даручэнне Старшыня Савета Рэспублікі. — Калі Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі не прапісана, то гэта сумна. Магчыма, трэба ўнесці пэўныя карэктывы. Паглядзіце зыходзячы з практыкі».

На працягу чатырох месяцаў Наталля Рыгораўна звярталася ў шэраг інстанцый, аднак яе пытаннем ніхто не хоча займацца. «Я на вашым месцы ўжо ў яе пабыла б і пытанне зняла, — заўважыла спікер, звяртаючыся да намесніка старшыні Мінгарвыканкама. — Трэба прыцягнуць да адказнасці вінаватых у валакіце. Разбярыцеся! Думаю, вы вырашыце гэта пытанне».

Наталлі Рыгораўне Старшыня Савета Рэспублікі паабяцала, што пытанне возьме на кантроль. Заяўніца падзякавала за дапамогу і папрасіла прабачэння за тое, што адрывае ад больш важных пытанняў, якімі займаецца Савет Рэспублікі, але ў жанчыны склалася безвыходная сітуацыя, якую яна ахарактарызавала як крык душы.

### Рамонт пасля рамонту?

На няякасны капітальны рамонт шматпавярховага дома па вуліцы Чарвякова ў сталіцы паскардзілася Алена Васілеўна, якая прадстаўляе інтарэсы ўсіх жыхароў. Жанчына расказала, што работы былі завершаны ў снежні 2023 года, аднак здадзены дом, па словах заяўніцы, з грубымі парушэннямі тэхналогій, у выніку чаго ў пад'ездзе асыпаецца фарба, па фасадзе пайшлі расколіны, ёсць праблемы з каналізацыяй. Большая частка работ, заяўленых у праекце, увогуле не выканана.

— Многія віды работ праводзіліся ў зімні час года, — удакладніла заяўніца. — Дах перасцілалі ў снегапады, у дажджлівае надвор'е фарбавалі фасады. Цяпер у жыхароў кватэр з'яўляецца цвіль. Гэта катастрофа! Мы не ведаем, што рабіць.

**Намеснік старшыні Мінгарвыканкама Алег КОРЗУН** пагаджаецца, што некаторыя праблемы ў гэтым доме звязаны з тым, у які час года праводзіліся пэўныя віды работ. «Гэтыя недахопы мы бачым, — падкрэсліў ён. — Пастаўлена задача да 30 красавіка іх выправіць».

Па словах Наталлі Качанавай, спяшацца не трэба. «Справа ў тым, што калі з'явілася цвіль у кватэрах, то гэта праблема, — заўважыла яна. — Вам трэба паглядзець больш дэталёва, чаму яна з'явілася. Цвіль — гэта сур'ёзна».

Спікер звярнула ўвагу на тое, што, калі пэўнай арганізацыяй выконваюцца рамонтныя работы, ёсць людзі, якія вядуць тэхнічны нагляд і падпісваюць працэнтоўку. «Яны бачылі, што робіцца дрэнна, і не маглі прыпыніць работы, а гэта — дзяржаўныя грошы, — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі. — За чый кошт цяпер будуць ліквідоўваць недахопы?»

Рэзюмуючы, Наталля Качанава запэўніла, што спецыялісты разбяруцца ў сітуацыі, выправяць няякасныя работы. Таксама спікер паставіла задачу — прыцягнуць да адказнасці вінаватых. Па словах намесніка старшыні Мінгарвыканкама, дырэктар арганізацыі, якая выконвала рамонт у жылым доме па вуліцы Чарвякова, быў вызвалены ад займанай пасады. Таксама ён дадаў, што гарадскія ўлады ад людзей не хаваюцца, а сустракаюцца з імі, адказваюць на пытанні.

«Можна сустракацца тысячу разоў, а выніку няма, — падкрэсліла спікер. — Патрэбен вынік! Людзі звярнуліся — зрабіце».

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Міжпарламенцкае ўзаемадзеянне і стасункі з моладдзю

## Падрабязнасці працоўнага тыдня членаў Савета Рэспублікі

• Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі СНД (МПА СНД) па пытаннях абароны і бяспекі Фелікс Яшкоў прыняў удзел у пасяджэннях Пастаяннай камісіі МПА СНД і Аб'яднанай камісіі пры МПА СНД па гарманізацыі заканадаўства бяспекі і супрацьдзеянні новым выклікам і пагрозам у рэжыме відэа-канферэнц-сувязі. Члены Пастаяннай камісіі Асамблеі завяршылі работу над праектам Рэкамендацый па ўдасканаленні прававога рэгулявання дзейнасці пагранічных ведамстваў дзяржаў — удзельніц СНД у сферы процідзеяння тэрарызму. Прыняцце Рэкамендацый дасць магчымасць зблізіць падыходы да тлумачэння палажэнняў нарматыўных прававых актаў у сферы процідзеяння тэрарызму, забяспечыць дастаткова адналастайнае і сістэмнае рэгуляванне адносін у гэтай сферы. Акрамя таго, члены Пастаяннай камісіі абмеркавалі канцэпцыю праекта мадэльнага закона «Аб аператыўна-вышуковай дзейнасці». У новай рэдакцыі мадэльнага закона ўлічаны сучасныя тэндэнцыі ў сферы ажыццяўлення аператыўна-вышуковай дзейнасці, вопыт прававога рэгулявання грамадскіх адносін у гэтай галіне ў дзяржавах — удзельніцах СНД і практыка яго прымянення. Абмеркаваны праекты канцэпцый мадэльных законаў «Аб навігацыйным забеспячэнні» і «Аб тэрытарыяльнай абароне».

• Савет Рэспублікі наведалі выкладчыкі, студэнты і магістранты юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Для ўдзельнікаў сустрэчы былі арганізаваны экскурсія па будынку Савета Рэспублікі і агляд музейнай экспазіцыі. У зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі яны азнаёміліся з асноўнымі напрамкамі дзейнасці верхняй палаты парламента, кампетэнцыяй пастаянных камісій Савета Рэспублікі, парадкам і асаблівасцямі работы над законапраектамі. Ад удзельнікаў мерапрыемства паступіў шэраг пытанняў, якія датычацца ўдасканалення заканадаўства, стадый заканатворчасці, уцягвання моладзі ў грамадска-палітычнае жыццё краіны, работы са зваротамі грамадзян.

• Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа» Ала Смаляк сустрэлася ў Гомелі з групай дзяцей з Херсонскай вобласці, якія прайшлі аздараўленне ў дзіцячым рэабілітацыйна-аздараўленчым цэнтры «Лясная паляна» ў Гродзенскай вобласці. Па дарозе дадому хлопцы і дзяўчаты спыніліся ў горадзе над Сожам. Ала Смаляк пацікавілася, ці спадабаўся ім адпачынак, што запомніцца больш за ўсё. Сенатар адрасавала дзецям словы падтрымкі, пажадала дабра і дабрабыту, уручыла падарункі. «За два тыдні адпачынку на гасціннай беларускай зямлі дзеці з Херсонскай вобласці прайшлі не толькі аздараўленне, але і атрымалі добрыя эмоцыі, новыя цікавыя знаёмствы, а галоўнае, змаглі паглыбіцца ў атмасферу бесклапотнага дзяцінства, — падкрэсліла парламентарый. — Як прызналіся самі хлопцы і дзяўчаты, з сабой яны вязуць толькі самыя цёплыя і добрыя ўспаміны аб нашай краіне і мараць зноў прыехаць у Беларусь».

**Вераніка КАНЮТА.**